выказванні ў яго прадмовах маглі быць механічна запазычаны з розных крыніц і не адлюстроўваць сапраўдных поглядаў Скарыны.

1. *Алиева, Б. А.* Теория двойственной истины и метод предметного разграничения в современной теологии / Б. А. Алиева // Наука и теология в XX веке: Критика теологических концепций науки. – М., 1972. – С. 193–205.

2. *Конан, У. М.* Эстэтычныя і маральна-этычныя сімвалы ў творчасці Скарыны / У. М. Конан // Спадчына Скарыны : зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў (1986) / укл. А. І. Мальдзіс ; АН БССР. – Мінск, 1989. – С. 107–112.

3. *Падокшын, С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі : Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С. А. Падокшын ; пад рэд. А. С. Майхровіча. – Мінск, 1990.

4. *Подокшин, С. А.* Скорина и Будный: Очерк философских взглядов / С. А. Подокшин. – Минск, 1974.

5. *Подокшин, С. А.* Франциск Скорина / С. А. Подокшин. – М., 1981.

6. Православие и современность: (Философско-социологический анализ) / АН УССР ; ответ ред. Б. А. Лобовик. – Киев, 1988.

7. *Чамярыцкі, В. А.* Літаратурныя крыніцы скарынаўскіх прадмоў / В. А. Чамярыцкі // Спадчына Скарыны : зб. матэрыялаў Першых скарынаўскіх чытанняў (1986) / укл. А. І. Мальдзіс ; АН БССР. – Мінск, 1989. – С. 113–139.

8. *Яскевіч, А. А.* Творы Ф. Скарыны. Жанравая структура. Філасофскія погляды. Мастацтва слова / А. А. Яскевіч. – Мінск, 1995.

9. *Meyendorff, J.* Theology in the Thirteenth Century: Methodological Contrasts / J. Meyendorff // Καθηγήτρια: Essays Presented to Joan Hussey for Her 80th Birthday. – Camberley / Currey, 1988. – P. 395–407.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРАЗНАЎСТВА ў першай палове XX ст.

***Л. Г. Клімовіч,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*старшы выкладчык кафедры тэатральнай творчасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Эвалюцыя тэатральнай крытыкі першай паловы XX ст. абумоўлена некалькімі фактарамі: самасцвярджэннем беларусаў як нацыі, станаўленнем і развіццём беларускага прафесійнага тэатральнага мастацтва. Крытыка асэнсоўвала пошукі твор-

чымі калектывамі нацыянальнай адметнасці, абмяркоўвала фарміраванне рэпертуару, своеасаблівасць акцёрскай школы і рэжысёрскіх метадалогій.

Новы этап у развіцці беларускай тэатральнай крытыкі звязаны з выхадам газеты «Наша ніва» (1906–1915). На старонках выдання сістэматычна асвятлялася дзейнасць тэатральных калектываў – Беларускага музычна-драматычнага гуртка ў Вільні, Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага. Былі надрукаваны артыкулы Я. Купалы, Я. Коласа, А. Бульбы. Галоўны аспект іх публіцыстычнай творчасці – тэарэтычнае абгрунтаванне эстэтычнай патрэбы народа ў нацыянальным мастацтве, яго ўздзеянне на станаўленне беларусаў як нацыі. Газета імкнулася паказаць адметнасць тагачаснага айчыннага тэатра, абудзіць цікавасць да яго гісторыі. Папулярызавала народную творчасць, заклікала захоўваць лепшыя здабыткі народнага мастацтва. Галоўным жа пытаннем тэатральнай крытыкі «Нашай нівы» было стварэнне нацыянальнага тэатра на Беларусі. Асноўныя тэатральныя рэцэнзенты газеты – пісьменнікі Я. Купала, Я. Колас, Э. Пашкевіч, Ц. Гартны, З. Бядуля, А. Бульба.

Адной з найбольш значных тэатразнаўчых публікацый пісьменніка і літаратуразнаўцы М. Гарэцкага з'яўляецца артыкул «Наш тэатр» («Калядная пісанка: 1913 г.») – своеасаблівая праграма далейшага развіцця нацыянальнага сцэнічнага мастацтва, дзе вызначаецца месца тэатра ў жыцці народа, яго грамадская функцыя і асветніцка-выхаваўчая роля. Звяртаецца ўвага на неабходнасць стварэння нацыянальнай школы драматургаў, акцёраў, рэжысёраў, нацыянальнага рэпертуару. М. Гарэцкі таксама публікаваў артыкулы, прысвечаныя асобным драматургам і дзеячам тэатра – В. Дуніну-Марцінкевічу, У. Галубку, рэцэнзіі на спектаклі.

Вялікае значэнне для развіцця крытычнай думкі мела дзейнасць Першага таварыства беларускай драмы і камедыі (1917–1920). Нацыянальны прафесійны тэатр толькі пачынаў сваю працу. Ён адчуваў патрэбу ў дапамозе і падтрымцы з боку крытыкі. У газетах «Дзянніца», «Гоман», «Беларусь», «Вольная Беларусь», «Звязда», «Звон», «Савецкая Беларусь», часопісе «Полымя» з’яўляліся крытычныя матэрыялы, у якіх аналізавалася ідэйна-творчая накіраванасць работы таварыства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя праблемы публікацый – нізкі ўзровень прафесіяналізму пастановак, неабходнасць падрыхтоўкі нацыянальных творчых кадраў – акцёраў і рэжысёраў, фарміраванне высокамастацкага рэпертуару, патрабаванне ад артыстаў ведання роднай мовы.

Тэатральная крытыка пастуупова выпрацоўвала крытэрыі ацэнкі мастацкага твора. Пытанні прафесіяналізацыі тэатра, рэжысуры, драматургіі, акцёрскага майстэрства, падрыхтоўкі кадраў даследуюцца у артыкулах Л. Родзевіча, М. Чарота, З. Бядулі і іншых практыкаў і тэарэтыкаў тэатра. Праблему рэпертуару як першачарговую вылучала газета «Звязда». У ёй быў надрукаваны вялікі артыкул «Беларускі савецкі тэатр» – своеасаблівы агляд беларускай драматургіі за 1919 г. У ім адзначалася, што беларуская літаратура, багатая паэтычнымі і драматычнымі творамі, мае вялікі прабел у нацыянальнай драматургіі.

З. Бядуля ў сваёй тэатральна-крытычнай дзейнасці звяртаў увагу на нацыянальную спецыфіку беларускага тэатральнага мастацтва, разглядаў праблемы фарміравання рэпертуару, пытанні акцёрскага і рэжысёрскага майстэрства, харэаграфіі ў драматычным тэатры. Ён вывучаў гісторыю тэатра ў артыкулах «З нарысаў па гісторыі беларускага тэатра», «Батлейка» («Вестник Наркомпроса», 1922, № 3, 4.), «Тэатр і выхаванне мас. Этапы развіцця беларускага тэатра» («Полымя», 1922, № 1); пісаў рэцэнзіі на спектаклі, вывучаў творчасць асобных дзеячаў тэатра, у прыватнасці Е. Міровіча.

Першая спроба напісання гісторыі беларускага тэатра была зроблена Ф. Аляхновічам. У манаграфіі «Беларускі тэатр», якая выйшла ў 1924 г. у Вільні, ён даследаваў развіццё нацыянальнага сцэнічнага мастацтва ад фальклорных вытокаў да прафесійнага стану ў 1920 г. З артыкуламі, прысвечанымі актуальным пытанням тэатральнага мастацтва, Ф. Аляхновіч часта выступаў у беларускім друку – «Думкі аб беларускім тэатры», «Беларускі вясковы тэатр», публікаваў матэрыялы ва ўкраінскіх выданнях.

Пэўнае значэнне для развіцця айчыннай тэатральнай справы адыграла дзейнасць Інстытута беларускай культуры (1922–1928), тэатральная падсекцыя якога прымала ўдзел у кіраўніцтве Беларускай драматычнай студыяй у Маскве, забяспечвала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускія тэатры нацыянальным рэпертуарам: праводзіла конкурсы на лепшую беларускую п’есу, рабіла заказы драматургам на творы канкрэтнай тэматыкі. Тэатральная падсекцыя інстытута праводзіла навукова-даследчую працу – арганізоўвала абмеркаванне новых п’ес, тэатральных прэм’ер, навуковых дакладаў тэарэтыкаў і практыкаў тэатра. Значная ўвага пры гэтым надавалася праблемам самабытнасці беларускага тэатра, пошукам уласнага стылю і метаду. Былі напісаны, але па розным прычынам не выдадзены тэрміналагічны зборнік М. Папова і зборнік «Беларускае мастацтва».

Значны ўплыў на станаўленне і развіццё нацыянальнага тэатральнага мастацтва ў розныя часы аказвалі тэатральныя дыскусіі. Акрамя таго, публічныя абмеркаванні практычных і тэарэтычных праблем сцэнічнага мастацтва і драматургіі садзейнічалі папулярызацыі тэатра, выконвалі інфармацыйную і прапагандысцкую функцыі.

Дыскусіі 1920-х гг. узніклі ў перыяд станаўлення тэатральнага прафесіяналізму на Беларусі. На старонках газет «Савецкая Беларусь» і «Звязда» спрэчкі вяліся паміж беларускімі адраджэнцамі, якія марылі пра стварэнне нацыянальнай тэатральнай школы, самабытнага сцэнічнага мастацтва, і наменклатурнымі ідэолагамі, якія імкнуліся ператварыць тэатральнае мастацтва ў школу пралетарскага выхавання.

Дыскусія 1921–1923 гг. адбылася на старонках газеты «Савецкая Беларусь»: абмяркоўваліся шляхі развіцця беларускага сцэнічнага мастацтва; разглядаліся праблемы рэпертуару і нацыянальнага стылю, прафесіяналізму ў тэатральнай практыцы і аб’ектыўнасці ў крытыцы; адзначалася няўвага выдавецтваў да публікацыі беларускіх п’ес, а рэжысёраў – да нацыянальнага рэпертуару. У дыскусіі прынялі ўдзел З. Бядуля, У. Галубок, З. Жылуновіч, Я. Журба, Я. Святляк і інш. Дыскусія скончылася трохдзённым грамадскім абмеркаваннем дзейнасці мінскіх тэатраў у форме папулярнага ў той час «суда над тэатрамі». На «лаўцы падсудных» былі кіраўнікі Беларускага, Рускага і Яўрэйскага тэатраў. У ролі «старшыні суда» выступаў С. Кацэнбоген, «сведкамі» былі Ф. Ждановіч і іншыя дзеячы тэатра, «экспертамі» – літаратары І. Замоцін і М. Чарот. Быў вынесены «прысуд»: «Прымаючы пад увагу тое, што тэатр з’яўляецца магутнаю зброяю ў руках пралетарыяту, суд



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызнае, што мінскія тэатры не ўсё рабілі для гэтага, і прызнае вінаватымі ў тым, што яны не шукалі шляхоў новай творчасці, а таксама не мелі сувязі з працоўнымі масамі» (6.4.1923). Абмеркаванне спрыяла папулярызацыі тэатральнага мастацтва. Тэатральная крытыка адзначыла поспех пастановак БДТ-1 «На купалле» М. Чарота, «Машэка», «Кастусь Каліноўскі», «Каваль-ваявода», «Кар'ера таварыша Брызгаліна» Е. Міровіча і народнай драмы «Цар Максіміліян» у Беларускай драматычнай студыі ў Маскве; папулярнасць на вёсцы Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатра У. Галубка.

Сітуацыя ў тэатральным мастацтве рэзка пагоршылася ў 1927–1930 гг., калі адначасова з рэалізацыяй праграмы індустрыялізацыі і калектывізацыі адбываўся ідэалагічны наступ на літаратуру і тэатральнае мастацтва з мэтай іх канчатковай пралетарызацыі і ліквідацыі вынікаў нацыянальнага адраджэння. Ад тэатра патрабавалася быць сацыялістычным, пралетарскім па змесце, што азначала адмаўленне ад ранейшай разнастайнай тэматыкі, зварот да сучаснасці, да выяўлення класавай сутнасці твораў мастацтва. На сцэне з'яўляюцца спектаклі, прысвечаныя класавай барацьбе, індустрыялізацыі і калектывізацыі. Сярод найбольш удалых п'ес, напісанных беларускімі драматургамі на гэту тэму, – «Мост» Рамановіча, «Міжбур'е» Д. Курдзіна, «Гута» Р. Кобеца.

У 1927 г. з рэпертуару тэатраў былі зняты «Тутэйшыя» Я. Купалы (БДТ-1), «Эрас і Псіхея» Е. Жулаўскага, «Апраметная» В. Шашалевіча, «Вакханкі» Еўрыпіда (БДТ-2). Аб'ектам вульгарна-сацыялагічнай крытыкі сталі замежныя класічныя і нацыянальныя творы з рэпертуару БДТ-2. Гэта выклікала пратэст з боку беларускай літаратурна-мастацкай грамадскасці.

Дыскусія 1927–1929 гг. праходзіла на старонках газет «Савецкая Беларусь» і «Звязда». Нацыянальную самабытнасць беларускага тэатра адстойвалі М. Зарэцкі, Т. Глыбоцкі, З. Жылуновіч. Нарком асветы А. Баліцкі склікаў усебеларускі з'езд працаўнікоў мастацтва, на якім выступіў з дакладам. Ён паспрабаваў прымірыць нацыянальную самабытнасць з «пралетарскім» інтэрнацыяналізмам і «па-сяброўску» крытыкаваў Т. Глыбоцкага за «памылковыя» выступленні супраць расійскага перакладнога рэпертуару на беларускай сцэне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1928 г. Бюро ЦК КП(б)Б прыняло пастанову «Аб беларускай літаратурнай, мастацкай і тэатральнай крытыцы», якая заклікала да барацьбы з класава варожымі пралетарыяту і сялянскай беднаце плынямі ў літаратуры, абавязвала фарміраваць нацыянальны па форме і пралетарскі па зместу тэатральны рэпертуар, ствараць рабочую тэатральную крытыку. На старонках газеты «Звязда» была арганізавана «праработка» Т. Глыбоцкага і іншых прыхільнікаў нацыянальнай самабытнасці тэатра. Пасля выключэння Т. Глыбоцкага з літаратурнага аб'яднання «Полымя» і выключэння з партыі З. Жылуновіча дыскусія ператварылася ў маналог вульгарна-сацыялагічнай крытыкі. Прыхільнікаў самабытнасці беларускага тэатра «выкрывалі» А. Баліцкі, В. Вольскі, Х. Дунец, М. Модэль, А. Някрашэвіч, А. Сянкевіч.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны тэатральныя дыскусіі трацяць абвострана палітычны напал і ўзнімаюць у асноўным праблемы, спецыфічныя для тэатральнага мастацтва і драматургіі.

Беларускі тэатр даўно стаў неад'емнай часткай сусветнай культуры. Тэатральная крытыка і тэатразнаўства на ўсіх этапах яго развіцця садзейнічалі тэарэтычнаму асэнсаванню спецыфікі тэатра, яго гісторыі і сучаснага стану, дыялектыкі фарміравання, узнікнення і змены мастацкіх напрамкаў. Па меры таго, як узрастала роля сцэнічнага мастацтва, павялічвалася і значэнне тэатразнаўчай навукі.

---

1. *Горобченко, Т.* Белорусский театр / Т. Горобченко // Очерки истории театроведения народов СССР (1917–1941). – М., 1985.

2. *Горобченко, Т.* Театральная критика / Т. Горобченко // Очерки истории науки и культуры Беларуси XIX – начала XX в. – Минск, 1996.

3. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка. – Т. 1. – 1983 ; Т. 2. – 1985 ; Т. 3, кн. 1. – 1987 ; Т. 3, кн. 2. – 1987.

4. *Мушынскі, М.* Беларуская крытыка і літаратуразнаўства / М. Мушынскі. – Мінск, 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ